могло бы решиться на местном уровне. Причинами этого является недостаточный уровень ответственности должностных лиц за качество работы с населением и несущественное наказание за игнорирование законных требований граждан.

Президент Республики Беларусь 9 ноября 2010 г. на совещании о повышении эффективности работы с обращениями граждан поставил задачу об устранении недостатков в работе госорганов с обращениями граждан до конца года.

К работе с обращениями граждан должны более активно подключаться и общественные объединения (профсоюзы, общественная организация «Белая Русь», БРСМ, «Союз женщин Беларуси» и др.), а также по всей вертикали власти должны быть задействованы все механизмы, чтобы предотвратить случаи формализма и бюрократизма.

Для создания эффективной системы обратной связи в госорганах Республики Беларусь необходимо реализовать следующее: обеспечить политические и социально-экономические условия развития управленческой активности и политической культуры населения; создать соответствующую законодательную и нормативно-правовую базу для укрепления обратной связи в системе госуправления; обеспечить адекватное развитие системы местного самоуправления; усовершенствовать механизм внешнего мониторинга в системе госуправления; систематическое проведение социологических исследований о реакции населения на деятельность органов власти и т.д.

# Секция 14

# ИСТОРИЧЕСКИЙ ОПЫТ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОГО И ПОЛИТИЧЕСКОГО РАЗВИТИЯ БЕЛАРУСИ

***А.А. Беднарская***
*БДЭУ (Мінск)*

## ГІСТОРЫЯ ЎЗНІКНЕННЯ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ г. ВАЎКАВЫСКА ДА ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XX СТАГОДДЗЯ

Сёння значна ўзрастае неабходнасць ведаць сваю гісторыю, тым больш гісторыю свайго роднага краю. Гістарычная памяць дае магчымасць кожнаму чалавеку лепш зразумець сваё месца на зямлі, пазнаць

і выкарыстаць багацейшую спадчыну продкаў, знайсці шлях да лепшага жыцця.

Тэрыторыя, на якой размешчаны сучасны Ваўкавыск, была заселена славянскім племенем дрыгавічоў, побач з якімі жыло племя яцвягаў. Уваходзілі гэтыя тэрыторыі ў склад Кіеўскай Русі, і ў XI—XII стст. кіеўскія князі заснавалі на берагах Нёмана і яго прытоках шэраг апорных пунктаў, у тым ліку і Ваўкавыск.

Развіццю гандлёвых сувязей садзейнічала зручнае геаграфічнае становішча горада: ён знаходзіўся на волакавым шляху, які злучаў басейны Дняпра, Заходняга Буга і Нёмана. Рака Ваўкавыя давала выхад у раку Рось, Рось — у Нёман, Нёман — у Балтыйскае мора.

Пра высокі ўзровень развіцця рамяства і культуры горада Ваўкавыска (і яго славянскім паходжанні) сведчыць той факт, што ў будаўнічых работах у вялікай колькасці прымяняліся «плінфы» (тонкая цэгла). На некаторых плінфах былі выяўлены царкоўныя княжацкія знакі, што належалі рускім князям дома Рурыкавічаў.

Заслугоўваюць быць згаданымі і свінцовыя пячаткі, якімі змацоўваліся дакументы дзяржаўнага прызначэння. Сярод іх знойдзена і пячатка з выявай князя Дзімітрыя.

У сваёй гісторыі Ваўкавыск неаднаразова цярпеў вялікія разбурэнні і няшчасці. У 1038 г. горад разбурылі яцвягі, у 1224 г. ён быў моцна разбураны нашэсцем татар і толькі вялікі князь Міндоўг у 1258 г. адбудаваў і ўпрыгожыў горад і замак. Горад захопліваўся крыжакамі. У 1409 г. магістр крыжакоў Ульрых Юнгінен уварваўся ў горад, разрабаваў яго і паланіў многіх жыхароў.

Вядома, што ў 1386 г. у Ваўкавыску Вялікі князь Ягайла прымаў польскіх паслоў для перамоў з імі. У 1387 г. Ягайла прыбыў у Ваўкавыск, дзе па яго загаду былі знішчаны ўсе язычніцкія бажніцы.

Пасля Гарадзельскай уніі 1413 г. Ваўкавыск увайшоў у склад Трокскага ваяводства. Паводле старажытных актаў, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Літвы, у 1513 г. у Ваўкавыску было 9 вуліц. З другіх дакументальных крыніц вядома, што ў горадзе ў XVI—XVII стст. было да 5 тыс. жыхароў. У лютым 1503 г. горад Ваўкавыск атрымаў Магдэбургскае права як дар польскага караля Аляксандра, яно пацвярджалася ў 1507 г. польскім каралём Жыгімонтам. Цэнтрам гарадскога самакіравання стаў магістрат, на чале якога стаяў войт, прызначаемы каралеўскай уладай. З 1566 г. Ваўкавыск з'яўляўся цэнрам павета ў складзе Навагрудскага ваяводства. Асноўную масу жыхароў горада складалі рамеснікі і дробныя гандляры. Ваўкавыскія рамеснікі выраблялі прылады працы, зброю, абутак, адзенне, посуд, займаліся апрацоўкай футра, прыгатаваннем віна, піва. Некаторы час Ваўкавыск быў месцам з'ездаў паслоў і сенатараў Вялікага княства Літоўскага (1576—1587). Паводле трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. горад быў уключаны ў склад Расійскай імперыі.

У 1904 г. на 22 фабрыках працавалі 200 рабочых. У пачатку XX ст. Ваўкавыск стаў буйным чыгуначным вузлом Беларусі, праз які штогод правозілася да 26 млн пудоў грузаў. У 1913 г. у горадзе было 18,9 тыс. жыхароў. З 1921 г. Ваўкавыск уваходзіў у склад Польшчы.

Такім чынам, па ўзроўні гаспадарчага і культурнага развіцця Ваўкавыск не адставаў ад іншых усходнеславянскіх гарадоў. Значная колькасць матэрыялу, атрыманага падчас даследвання, сведчыць аб высокім узроўні развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры горада.

*Літаратура*


1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. — Т. 4: Варанецкі — Гальфстрым. — Мінск: БелЭн, 1997. — 480 с.
2. Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей: матэрыялы навук.-практ. краязнаўчай канф., Ваўкавыск, 22 снежня 1995 г. / пад рэд. І.П. Крэня [і інш.]. — Ваўкавыск, 1997. — 268 с.
3. *Рассадзін, С.Я.* Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі / С.Я. Рассадзін, А.М. Міхальчанка. — Мінск: Беларусь, 2005. — 128 с.
4. *Крэнь, І.* Ваўкавыск — старажытны і малады беларускі горад / І. Крэнь // Гродзенская праўда. — 2005. — 28 чэрв.
5. *Малішэўскі, У.А.* Нашы гарады / У.А. Малішэўскі, П.М. Пабока. — Мінск: Нар. асвета, 1991. — 303 с.
6. *Князева, В.* Падарожжа па Беларусі: гарады і гарадскія пасёлкі / В. Князева. — Мінск: Беларусь, 2005. — 303 с.
7. Памяць: гістарычна-дакументальная хроніка Ваўкавыскага раёна. — Мінск: БЕЛТА, 2004. — 528 с.
8. Рэспубліка Беларусь: вобласці і раёны: энцыкл. давед. / аўт.-склад. Л.В. Календа. — Мінск: БелЭн, 2004. — 568 с.



***Ю.А. Лепешкевич***
*БГЭУ (Минск)*


## ВНЕШНЕЭКОНОМИЧЕСКИЕ СВЯЗИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В КОНЦЕ XX — НАЧАЛЕ XXI в.

Республика Беларусь является государством в центре Европы. Ее территория — своеобразный перекресток, где сходятся важнейшие пути сообщения. Поэтому одним из приоритетов экономического развития Беларуси является поддержка экспортного производства и внешнеэкономической деятельности в целом.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by